АКАДЭМІЯ НАВУК БЕЛАРУСІ

ІНСТЫТУТ МАСТАЦТВАЗНАЎСТВА, ЭТНАГРАФІІ І ФАЛЬКЛОРУ
імя К.КРАПІВЫ

На правах рукапісу

МАЦЮХ Мікалай Данілавіч

# ПАЭТЫКА ВЯСЕЛЬНАЙ ПЕСНІ:
# КАМПАЗІЦЫЯ, ВЫЯЎЛЕНЧЫЯ СРОДКІ:
# ЭПІТЭТ, СІМВОЛІКА, МЕТАФАРА

10.01.09 -- фалькларыстыка

А у т а р э ф е р а т

дысертацыі на атрыманне вучонай ступені
кандыдата філалагічных навук

Мінск - 1994

AB 30,387

ЛННБ України ім.В.Стефаника
00777578 (+)

Работа выканана у аддзеле фальклору Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы АНБ.

Навуковы кіраўнік - доктар філалагічных навук, прафесар А.С.Фядосік

Афіцыйныя апаненты: доктар філалагічных навук, прафесар Грынчык М.М.

кандыдат філалагічных навук Касько У.К.

Вядучая арганізацыя - Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М.Кірава

Абарона дысертацыі адбудзецца 24 чэрвеня 1994 года у 14 гадзін на пасяджэнні спецыялізаванага савета К 006.07.01 па абароне дысертацый на атрыманне вучонай ступені кандыдата філалагічных навук пры Інстытуце мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы АНБ (220072, Мінск, вул. Сурганава, 1, корп. 2).

З дысертацыяй можна азнаёміцца у Цэнтральнай навуковай бібліятэцы імя Якуба Коласа АНБ.

Аўтарэферат разасланы "23" чэрвеня 1994 года.

Вучоны сакратар спецыялізаванага савета Л.М.Салавей

© Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы АНБ. 1994.

ЛНБ ім. В. Стефаника
АН України

АГУЛЬНАЯ ХАРАКТАРЫСТЫКА РАБОТЫ

Дысертацыя прысвечана даследаванню мала вывучанай мастацкай спецыфікі беларускіх вясельных песень, шматлікія з якіх добра захаваліся ў народзе і вылучаюцца надзвычайнай тэматычнай разнастайнасцю і паэтычнай дасканаласцю.

Цэласны аналіз песні дазваляе раскрыць яе ідэйны змест, прынцыпы структурнай арганізацыі, сістэму вобразаў, што з'яўляецца асновай для яе вывучэння ў кантэксце рэгіянальнай, гісторыка-культурнай традыцыі, без якой немагчыма вырашыць другія пытанні паэтыкі народнай паэзіі.

Актуальнасць даследавання. Беларуская вясельная песня ўяўляе сабой спецыфічную з'яву народнай творчасці, з'яўляецца адным з багацейшых пластоў не толькі ў беларускай, але і ў славянскай народнапесеннай творчасці. Да сённяшняга часу найменш даследаваны кампазіцыя і вобразна-выяўленчыя сродкі (эпітэт, сімволіка, метафара). Н.С.Гілевіч, К.П.Кабашнікаў, Л.А.Малаш і іншыя беларускія вучоныя[I] разглядалі ў сваіх працах толькі некаторыя аспекты праблем паэтыкі, адзначалі, што дзякуючы непаўторнай своеасаблівасці зместу твораў асобныя элементы паэтыкі маюць адметныя рысы. Аднак цэльнага даследавання па гэтай тэме, якое б раскрывала спецыфіку класічных узораў народнага мастацтва слова, нацыянальную своеасаблівасць паэтыкі, не было.

Выбар тэмы дысертацыі абумоўлены не толькі нераспрацаванасцю праблемы, але і навуковым, пазнавальна-выхаваўчым значэннем вясельнай паэзіі. Песня — найбольш старажытны від народнай творчасці — вызначаецца своеасаблівай кампазіцыяй, багаццем вобразна-выяўленчых сродкаў у вуснай славянскай паэзіі наогул, у тым ліку і беларускай вясельнай песні. Выявіць іх спе-

[I] Гілевіч Н.С. Паэтыка беларускай народнай лірыкі. Мн., 1975; Варфоломеева Т.Б. Северобелорусская свадьба. Мн., 1988; Малаш Л.А. Вясельныя песні // Вяселле. Песні: У 6-ці кнігах. Мн., 1980. Кн. I. С. 5-18; Кабашнікаў К.П. Беларускі фальклор у параўнальным асвятленні. Мн., 1981; Фядосік А.С. Песні заручын і ад'езду маладога да нявесты // Вяселле. Песні: У 6-ці кнігах. Мн., 1980. Кн. I. С. 20-32; Ліс А.С. Валачобныя песні. Мн., 1989.

цыфіку, вызначыць іх ролю ў вясельнай песні — асноўная задача даследавання.

Метадалагічная аснова даследавання. У дысертацыі выкарыстаны вопыт даследчыкаў беларускай, рускай, украінскай народнай паэзіі, у тым ліку і ў вывучэнні вясельнай песні.

Важнае значэнне мае выкарыстанне вопыту даследавання гістарычнай паэтыкі народнапесеннага фальклору ў працах фалькларыстаў: Е.Р.Раманава, М.Я.Нікіфароўскага, М.В.Доўнар-Запольскага, Р.Р.Шырмы, Н.С.Гілевіча, К.П.Кабашнікава, А.С.Фядосіка, А.С.Ліса, А.С.Янкоўскага, В.М.Коўтун, Л.А.Малаш, І.К.Цішчанкі і інш. Іх працы ўнеслі значны ўклад у тэарэтычную спадчыну беларускай фалькларыстыкі.

Аб'ект даследавання. Даследуюцца тыпы кампазіцыі і вобразна-выяўленчыя сродкі (эпітэт, сімволіка, метафара) беларускай вясельнай песні. Аўтар імкнецца раскрыць іх асаблівасці, падкрэсліць нацыянальную адметнасць паэтычных сродкаў. Складанасць такога даследавання тлумачыцца тым, што да сённяшняга дня няма спецыяльнай працы па тэорыі паэтыкі вясельнай народнай песні, адсутнічае падручнік або вучэбны дапаможнік па паэтыцы беларускага фальклору.

Дысертант адзначае, што беларуская вясельная песня мае сваю гісторыю стварэння, бытавання і з'яўляецца адной з багацейшых у мастацка-паэтычным плане сярод славянскай вясельнай паэзіі. Зыходзячы з гэтага, пры даследаванні народных твораў ён карыстаецца не методыкай літаратуразнаўчай стылістыкі, а прыёмамі аналізу, якія ўласцівы фалькларыстыцы, практыцы выяўлення і вызначэння асаблівасцей кампазіцыі, функцый вобразна-выяўленчых сродкаў. Гэта абумоўлена тым, што ў вясельнай песні ў сінкрэтычным выглядзе спалучаюцца ў адзінае славесныя, музычныя, лірыка-драматычныя элементы. Акрамя таго, яна з'яўляецца адным са старажытных і самабытных відаў народнай паэзіі, у якім найбольш яскрава выявіліся нацыянальныя рысы, побыт, культура народа Беларусі.

Навуковая навізна. У рабоце зроблена спроба раскрыць мастацкія вартасці, эстэтычнае багацце вясельнай песні праз аналіз кампазіцыі і вобразна-выяўленчых сродкаў: эпітэта, сімволікі, метафары, выяўленне іх асаблівасцей і заканамернасцей выкарыстання, а таксама ўзаемасувязі песні і абрадавай дзеі.

Даследаванне паэтыкі вясельных песень дазваляе прасачыць часткова наяўнасць агульных усходнеславянскіх і своеасаблівых адметных нацыянальных рыс у кампазіцыі, працэс фарміравання сістэмы вобразна-выяўленчых сродкаў (эпітэта, сімволікі, метафары) і спосабы іх спалучэння з іншымі паэтычнымі элементамі.

Практычнае значэнне і апрабацыя. Палажэнні і высновы, выкладзеныя ў дысертацыі, адлюстраваны ў асобных артыкулах. Дысертацыя абмяркоўвалася на пасяджэннях аддзела фальклору Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АНБ. Асноўныя палажэнні апрабіраваны ў дакладах, прачытаных на рэспубліканскіх навуковых канферэнцыях.

Работа можа быць выкарыстана пры падрыхтоўцы падручніка па паэтыцы беларускага фальклору, у далейшай распрацоўцы праблем паэтыкі, у спецкурсах вышэйшых навучальных устаноў.

Галоўная задача работы — грунтоўна даследаваць важнейшыя пытанні паэтыкі вясельных песень, асабліва тыя, якія раней не разглядаліся ў беларускай фалькларыстыцы. У дысертацыі ўпершыню зроблена спроба раскрыць найбольш характэрныя кампазіцыйныя формы і прынцыпы структурнай арганізацыі твораў і сістэму вобразна-выяўленчых сродкаў, якія часцей ужываюцца і ствараюць дасканалы мастацкі шэдэўр. Аналіз іх дазваляе найбольш поўна раскрыць нацыянальную асаблівасць, мастацка-стылявое, лексіка-семантычнае багацце вясельнай песні.

Аднаўленне духоўнага жыцця, адраджэнне народных свят і абрадаў, пазбаўленне грамадскіх навук ад ідэалагічнага дактрынёрства дабратворна садзейнічае аб'ектыўнаму вывучэнню народна-песеннага фальклору як жывой духоўнай спадчыны беларускага народа. Гэта мае непасрэднае дачыненне і да вясельнай песні, якая фарміравалася вякамі і ў ёй знайшлі адлюстраванне паэтычнае мысленне, эстэтычныя, маральныя ідэалы, духоўная культура і талент народа. Пытанні паэтыкі вясельных песень разглядаліся часцей за ўсё праз прызму сучаснай абраднасці, без уліку культурна-гістарычнага працэсу, народна-традыцыйнай асновы.

Крыніцы даследавання. У дысертацыі выкарыстаны апублікаваныя вясельныя песні, перш за ўсё ў 8-мі тамах шматтомнага збору беларускай народнай творчасці, а таксама ў зборніках П.В.Шэйна, Е.Р.Раманава, М.Федароўскага, Р.Р.Шырмы, Н.С.Гілевіча і інш Даследаваліся матэрыялы з архіваў Інстытута мастацтвазнаўства,

этнаграфіі і фальклору АНБ, Беларускага дзяржаўнага універсітэта, аддзела рэдкай кнігі Цэнтральнай навуковай бібліятэкі імя Я.Коласа і інш.

Структура работы. Дысертацыя складаецца з уводзін, двух раздзелаў, заключэння і бібліяграфіі. У першым раздзеле даследуецца кампазіцыя вясельных песень, у другім — разглядаюцца вобразна-выяўленчыя сродкі вясельнай паэзіі, з якіх дысертант абмежаваўся аналізам эпітэта, сімволікі і метафары як найбольш папулярных у народзе.

Ва ўводзінах абгрунтоўваецца важнасць і актуальнасць тэмы, яе навізна, ставяцца мэты і задачы даследавання, раскрываюцца метадалагічныя асновы работы, яе практычнае значэнне і апрабацыя, крыніцы даследавання.

Першая глава прысвечана кампазіцыі вясельных песень. Тэматыка вясельных песень разнастайная. У іх адлюстроўваюцца сацыяльна-прававыя адносіны членаў ствараемай новай сям'і, галоўныя дзеючыя асобы рытуалу, маральна-этычныя погляды, абрадавыя дзеянні і інш. У вяселлі па-мастацку ўвасабляецца рэальнасць з яго нацыянальнымі абрадамі. Усё, што непасрэдна адбываецца ў межах карціны вясельнага абраду, раскрываецца праз прызму дзеянняў персанажаў. Змест песень і іх кампазіцыйная схема маюць два значныя элементы. З дапамогай кампазіцыйнай схемы песня падзяляецца на эпізоды, якія лагічна, тэматычна звязаны паміж сабою і аформлены паслядоўна, накшталт таго, як паслядоўна выконваецца вясельны абрад. Гэта дазваляе найбольш глыбока раскрыць тэматычную аснову твора. Сувязь песні з абрадам, галоўным чынам, генетычная: яна адлюстроўвае яго змест, каменціруе ход выканання, раскрывае і дае ацэнку таму, што адбываецца на кожным вясельным этапе згодна з законамі вясельнай драматургіі, звычайнымі і ідэальнымі нормамі чалавечага быцця. Вясельны абрад аб'ядноўвае ў сабе апавядальную і рытуальную субстанцыі. Прычым абрадавая не толькі афармляе апавядальную, але і падпарадкоўвае яе сабе, вызначае спецыфіку яе гучання.

Кампазіцыі вясельнай песні ўласцівы дзве галоўныя тэндэнцыі. Першая вызначаецца падпарадкаваннем сэнсавай і структурна-тэматычнай арганізацыі, другая адлюстроўвае паэтычныя традыцыі твора і падзяляе яго на рэальную і сімвалічную часткі. Асаблівасць кампазіцыі заключаецца ў спецыфіцы арганізацыі,

прынцыпах суадносін і спалучэнні яе кампанентаў.

На характар фарміравання кампазіцыі ўплывае тое, што песня будуецца як невялікі лірыка-драматычны твор, у якім знаходзяць адлюстраванне ўзаемаадносіны персанажаў, карціны вясельнага рытуалу, душэўны стан герояў. Усё гэта адлюстроўваецца ў апавядальных, апавядальна-каменціруючых песнях. Абрадавыя дзеянні персанажаў характарызуюцца шматфункцыянальнасцю, што абумовіла з'яўленне розных відаў вясельных песень: імператыўных, заклінальных, велічальных, карыльных.

Характар зместу, сістэма вобразаў, карцін прыроды і абрадаў, адлюстраваных у рэальнай і сімвалічнай формах, і абумовілі ўтварэнне і выкарыстанне кампазіцыйных прыёмаў: маналога і дыялога з апавядальнай часткай у розных варыянтах, паралелізмаў, паўтораў (складовых, спіральных), ступеньчатага звужэння вобразаў, выдзялення адзінага з цэлага, кантрастаў, градацыі, рыфмы і г.д. — усе яны ўжываюцца ў адпаведнасці з паэтычным зместам, яго ідэйна-эстэтычнымі патрабаваннямі і падпарадкаваны стварэнню структурна-вобразнага, рытміка-інтанацыйнага адзінства, арганізацыі лірыка-драматычнай песні. Выкарыстанне кожнага з кампазіцыйных прыёмаў у песні матывавана, і яны адыгрываюць сваю ролю ў адпаведнасці з мастацкімі функцыямі твора.

Дыялог, маналог у шэрагу песень (карыльных, велічальных) мае рэальную і сімвалічную аснову, а структурныя яго кампаненты аб'яднаны ў кампазіцыйнае і вобразнае адзінства. Калі перад дыялогам ёсць зачын, то ён удакладняе час і месца дзеяння. Для песень-маналогаў уласціва плаўнасць, а для твораў з дыялагічнай асновай, з функцыянальнасцю зваротаў, выклічнікаў, лагічна звязаных паміж сабою, характэрна эмацыянальнасць, экспрэсіўнасць.

У драматычна напружаныя моманты песні канец дыялога завяршае дзеянне альбо заклік да аднаго з яго персанажаў. Маналог, дыялог важныя ў двух адносінах: па-першае, ён прадстаўляе адну з традыцыйных мастацкіх сітуацый у вясельнай песні, па-другое, з'яўляецца пачаткам лірыка-драматычнага апавядання. Па зместу маналог і дыялог блізкія, а стылістычна пабудаваны па-рознаму. Дыялог набывае характар двух-, трохслойнасці дзякуючы існаванню дзвюх катэгорый: адлюстраванню свету і быцця і ўключэнню ў песню двух і больш дзеючых асоб.

Дыялог, маналог з апавядальнай часткай у розных варыянтах

з'яўляюцца базавымі двухпланавымі, самастойнымі кампазіцыйнымі прыёмамі, выкарыстанне іх абумоўлена прыналежнасцю вясельнай песні да абрадавай паэзіі.

Паўтор выконвае функцыю выдзялення слова і словазлучэння, задачу фарміравання рытму, рытміка-інтанацыйна арганізуе песню. Пры яго дапамозе рэалізуецца агульнасінтэзаваны план структуры твора, раскрываецца ідэя, якая закладзена ў песні. Гэтаму садзейнічае псіхалагізм, эмацыянальнасць, традыцыйная функцыянальнасць. Гэта абумовіла дамінуючую ролю рэальных і сімвалічных вобразаў у паралелізмах: расшыфроўку алегорый, адлюстраванне стану персанажаў у розных сацыяльна-бытавых, абрадавых сітуацыях, наяўнасць своеасаблівай якасці ўнутрытэкставых асацыяцый.

Роля паралелізмаў (псіхалагічнага, сэнсавага, фармальнага, сінтаксічнага, страфічнага і іншых) у вясельных песнях набывае своеасаблівае значэнне. Яны выконваюць кампазіцыйна-вобразную функцыю, з'яўляюцца сродкамі адлюстравання мастацка-абрадавай, сацыяльна-бытавой падзеі, душэўнага стану персанажаў. Вясельным песням, пабудаваным пры дапамозе паралелізмаў, уласцівы вобразны псіхалагізм, глыбіня падтэксту, своеасаблівая эмацыянальная танальнасць, а пейзаж іх — часцінка прыроднага свету, асэнсаваная інтанацыйна ў чалавечым ключы, выступае дзейсным структураўтвараючым элементам.

Роля паралелізму вызначаецца ў метрычным дзеянні тэксту, страфічнай арганізацыі: сходны рух думак, дзеянняў у адпаведных частках песень стварае анафарычныя, эпіфарычныя канструкцыі і іншыя стылістычныя фігуры, Звароты, выклічнікі, шматзлучнасць рыфмы і г.д. арганічна спалучаюцца у канкрэтную кампазіцыйна-паэтычную тканіну і прадвызначаюць мастацкую цэласнасць твора, яго інтанацыйна-сэнсавае адзінства.

Кампазіцыя характарызуецца стройнасцю, дынамізмам. Усе яе кампаненты ўзаемазвязаны, узаемаабумоўлены. Для паэтыка-сінтаксічнага ладу ўласцівы дакладны адбор лексічных сродкаў, якія вызначаюць прадметы, дзеянні персанажаў. З дапамогай кантрасту ствараецца неабходная ідэйна-эмацыянальная афарбоўка, вострая драматычная калізія, павышаецца экспрэсіўнасць твора. Вобразна-кампазіцыйны кантраст відазмяняе структуру твора, яскрава выдзяляе дэталі вобраза, карціны вясельнага рытуалу, фрагменты

сацыяльна-бытавога жыцця.

Строфы вясельных песень, пабудаваныя на антытэзе, ствараюць і развіваюць у сэнсавых адносінах супрацьлеглыя карціны, а дакладны паўтор сінтаксічных канструкцый будуе рытмічны рух і паглыбляе кантраст.

Структура песні, яе архітэктоніка грунтуюцца на сувязі, лагічнасці яе кампанентаў, усяго мастацкага комплексу. Гэта дазваляе праз прызму падзей адлюстраваць у сціслай форме маральна-этычныя ўзаемаадносіны персанажаў, змест карцін вясельнага рытуалу і г.д.

Прыём ланцуговай сувязі заключаецца ў тым, што наступныя прадметы, якія размешчаны адзін за другім, карціны ці эпізоды абраду звязваюцца на аснове вобразна-паэтычнай асацыяцыі і матываваны паміж сабой нібы ланцужком, у якім кожны наступны вобраз карціны, эпізода з'яўляецца сэнсавым лагічным працягам і канкрэтызацыяй, паэтычным развіццём папярэдняга яму вобраза, а апошні — вызначальным, галоўным у кампазіцыйным афармленні твора.

Разглядаючы кампазіцыйны прынцып выдзялення адзінага з цэлага, даследчык падкрэслівае тую асаблівасць, якая характэрна вясельным песням, — выдзяляецца той прадмет карціны абрадавага дзеяння, на які сканцэнтраваны асноўны сэнс і вакол якога разгортваецца галоўная дзея і ствараецца, па словах В.Коўтун, "вобразнае адзінства" канкрэтнай вясельнай сітуацыі.

Рыфма выконвае ў вясельнай песні кампазіцыйную, эўфанічную, рытміка-інтанацыйную ролю. Яна з'яўляецца паэтычным сродкам, з дапамогай якога асэнсоўваецца дзея, вобраз, кампазіцыйна арганізуе твор па гарызанталі і вертыкалі, а перакрыжаваныя рыфмы ў большай ступені, чым парныя, адпавядаюць жывой гутарковай мове з унутры распаўсюджанымі сінтаксічнымі канструкцыямі, насычанымі аднароднымі членамі і сінтаксічнымі абаротамі. Сэнсавая выразнасць рыфмы яскрава праяўляецца ў лексічнай, інтанацыйнай функцыі.

Найбольш распаўсюджанымі відамі паўтораў у вясельнай песні з'яўляюцца анафара, эпіфара, якія стылістычна, рытміка-інтанацыйна звязаны з іншымі сінтаксічнымі фігурамі. Яны спрыяюць выдзяленню сэнсавых апорных словазлучэнняў у страфе, дзякуючы якім песня набывае своеасаблівую эмацыянальную афарбоўку, ствараецца народнапесенная інструментоўка, гарманічна фар-

фіруецца.

Рытміка, інтанацыя пераадольваюць часовыя і прасторавыя межы, лагічна падкрэсліваюць рысы ў адносна самастойных вобразах. Мікрарытм у значнай ступені ствараецца пульсацыяй ключавых слоў у радку і страфе, іх камунікатыўнай функцыяй і садзейнічае паступоваму раскрыццю зместу песні, яе гарманізацыі. Кампазіцыя песні не толькі структурна-арганізацыйная катэгорыя, але і эстэтычная.

Прыпевы павышаюць рытмічнасць, эмацыянальнасць, з'яўляюцца своеасаблівым пераходным мосцікам паміж страфамі ў плане рытмічна-інтанацыйнай арганізацыі твора. Унутраныя і знешнія прыпевы лёгка ўпісваюцца ў песню, ствараюць своеасаблівую інтанацыю пры дапамозе "захопаў".

Кампазіцыйныя прыёмы вясельнай песні ў кожным з яе відаў (велічальных, імператыўных, заклінальных і іншых) знаходзяцца у непарыўным адзінстве з другімі кампазіцыйнымі сродкамі і рытмікай, мелодыкай і г.д. складаюць цэласную мастацкую сістэму, якая з'яўляецца асаблівасцю стылявога вобліку, вызначаецца непаўторнасцю твораў гэтага віду беларускага фальклору. Нягледзячы на наяўнасць дзвюх кампазіцыйных частак, падзеі ў песні разгортваюцца ў строгай паслядоўнасці. Цэласнасць тэксту вясельнай песні, яе ўнутранае адзінства і гарманічнасць нязменна звязаны з разнастайнасцю і спалучэннем паміж сабою тых сінтаксічных схем, на базе якіх будуецца твор.

Даследуючы розныя тыпы кампазіцыі вясельнай песні, як унутраную і знешнюю суадноснасць са зместам, даследчык прыходзіць да вываду, што павышэнне ці спад экспрэсіі знаходзіцца у прамой залежнасці ад частаты паўтораў, рытмічных фігур, іх лагічнай, тэматычнай паслядоўнасці і ўзаемасувязі.

Наяўнасць новых кампазіцыйных тыпаў павялічвае і ўзбагачае арсенал прыёмаў і паступовага мастацкага разгортвання тэмы вясельных песень. Дзякуючы гэтаму ўзрасла іх мастацкая дасканаласць, выразна праявілася нацыянальная адметнасць.

Цэласнасць тэксту вясельнай песні ствараецца зместавым адзінствам, унутранай сэнсавай арганізацыяй. Такая сэнсавая сувязь знаходзіць сваё выяўленне ў спалучэнні розных кампазіцыйных фігур і праяўляецца ў наступным:

– шматпланавасці, разнастайнасці спалучэння кампазіцыйных

сродкаў;

- выкарыстанні як агульнафальклорных кампазіцыйных прыёмаў, так і спецыфічнасці функцый у структурнай арганізацыі твора;

- складанасці кампазіцыйнай арганізацыі і разам з тым своеасаблівасці пабудовы твора.

У выніку аналізу вясельнай песні выяўлены новыя спосабы кампазіцыі, вызначаны асноўныя яе тыпы і тэндэнцыі выкарыстання, падпарадкаванасць іх ідэйна-эстэтычнай задачы твора.

Нашы назіранні пацвярджаюць думку аб гарманічнай сувязі і абумоўленасці з асноўнай ідэяй усіх кампанентаў кампазіцыі як самастойнага цэлага, шырыні магчымасцей кожнага з іх.

Адзін са шляхоў, па якому ішло фарміраванне кампазіцыйных прыёмаў вясельнай песні, характарызаваўся рухам эстэтычнай думкі народа ад фармальнай і зместавай структуры сінтаксічнай канструкцыі да адпаведнага прынцыпу кампазіцыйнай арганізацыі твора.

<u>Другая глава</u> "Вобразна-выяўленчыя сродкі" складаецца з трох частак, прысвечаных эпітэту, сімволіцы, метафары.

У падраздзеле "Эпітэт" робіцца аналітычны агляд публікацый па гэтай тэме. Адзначаецца, што няма адзінага погляду на вызначэнне ролі эпітэта ў абрадавай паэзіі, у тым ліку вясельнай песні. Характарызуюцца асноўныя функцыі эпітэта ў вясельнай песні — гэта абмалёўка персанажаў, адлюстраванне іх узаемаадносін, апісанне прадметаў вясельнага рытуалу, узмацненне зрокавай выразнасці, перадача слыхавых уражанняў. Пры гэтым выкарыстоўваюцца пастаянныя, выяўленчыя, метафарычныя, ацэначныя, тлумачальныя, этнічныя, эмацыянальна-псіхалагічныя і іншыя эпітэты. Ужыванне кожнага з іх не толькі матывавана тым, што для песні характэрна свая спецыфіка зместу і роля ў вясельным абрадзе.

Мастацкая прырода вясельнай песні прадвызначыла частае ўжыванне пастаянных, выразных эпітэтаў, якія выконваюць не толькі вобразна-выяўленчую, але і кампазіцыйную ролю. Дысертант адзначае, што ў вясельных песнях ёсць эпітэты двух катэгорый: агульнафальклорныя, г.зн. тыя, якія сустракаюцца ў многіх жанрах беларускага фальклору, і тыя, што ўжываюцца толькі ў гэтых песнях. Матывацыя эпітэта бывае рэальнай і умоўнай у залежнасці ад ідэі і зместу твора. Акрамя таго, адзін з вядучых яго аспектаў — гэ-

та ацэначны і паэтызуючы характар. Напрыклад, у сатырычных песнях эпітэты часцей за ўсё даюць адмоўную ацэнку і таму не маюць такіх элементаў паэтызацыі, а ў другіх песнях (імператыўных, велічальных, карыльных) персанажы, прадметы, з'явы маюць свае ўстойлівыя вызначэнні, якія абумоўлены абставінамі, тыповымі для адносін персанажаў ці рытуальных вясельных сітуацый.

У вясельных песнях функцыяніруюць простыя, складаныя, разгорнутыя, а па частаце ўжывання ацэначныя, спецыфічныя, этнічныя эпітэты, якія ўласцівы вясельным песням пры апісанні, характарыстыцы рытуальных прадметаў, персанажаў, некаторых абрадавых карцін і дзеянняў. Асаблівую ўвагу дысертант звяртае на тое, што вясельная песня стварыла новыя эпітэты, невядомыя песеннай лірыцы, якія падкрэсліваюць рысы персанажаў, нязначныя перамены ў псіхалагічным стане, паводзінах, асаблівасцях вясельных атрыбутаў.

Асобна ўзятыя эпітэты не ствараюць паэтычнасці, а кантрастнае спалучэнне ўспрымаецца як бы нябачна, але адначасова стварае выразнасць, драматызм, канкрэтызуе вобразы персанажаў у станоўчым і адмоўным паралелізме і ўтрымлівае сваю суадноснасць з рознымі карцінамі, пры гэтым мабілізуюцца выяўленчыя магчымасці эпітэта. Да разраду складаных эпітэтаў адносяцца незвычайныя па форме двайныя эпітэты, аднародныя і супрацьлеглыя па значэнню: эпітэты — прыдаткі. Іх роля — надаць вобразу, карціне асаблівую каларытную эмацыянальнасць, зрабіць страфу найбольш экспрэсіўнай. Ствараецца каларыт паэтычнасці, унутраны стан персанажаў перадаецца выкарыстаннем эмацыянальна-псіхалагічных эпітэтаў, з дапамогай якіх раскрываецца лірыка-драматычныя карціны вясельнага абраду, рэальныя і сімвалічныя вобразы, карціны набываюць асаблівае эмацыянальнае гучанне, узрастае іх мастацка-псіхалагічная значнасць.

Эпітэт не толькі набывае памяншальна-ласкальную форму ў велічальных, карыльных песнях, калі далучаецца да назоўніка такой жа формы, але стварае лірычную ці рамантычную аснову, надае персанажу, карціне эмацыянальнае ацэнне, выдзяляе галоўныя і дапаможныя рысы. Функцыя эпітэта ў велічальных, карыльных песнях удала спалучаецца з таўталогіяй, параўнаннем, гіпербалай. Ён не толькі актыўна ўплывае на танальнасць, экспрэсіўнасць, але стварае лірычнасць, а пры дапамозе памяншальна-ласкальнай формы,

якую і сам прымае, утварае эмацыянальна-лірычную плынь. Эпітэты дапамагаюць перадаваць прасторавыя ўяўленні. Галоўную ролю выконваюць назоўнікі, якія называюць прасторавыя прадметы, але прымыкаючыя да іх эпітэты канкрэтызуюць карціну, актыўна ўдзельнічаюць у перадачы месца дзеяння. Найбольш яскрава праяўляецца роля эпітэта ў карцінах, створаных пры дапамозе кампазіцыйнага прыёму ступеневага звужэння вобразаў. У іх пабудове ўдзельнічаюць зрокавыя, выяўленчыя эпітэты, якія перадаюць форму, колеравы рух, палітру якога выдзяляе вядучы эпітэт. Ён утварае своеасаблівы эпіцэнтр, семантычна звязаны з другімі эпітэтамі.

Падбор і выкарыстанне эпітэтаў абумоўлены мастацкімі, рэгіянальнымі, этнічнымі асаблівасцямі песні. Па сваймму прызначэнню эпітэты падзяляюцца на вызначальныя, якія падкрэсліваюць асноўныя рысы вобразаў персанажаў, іх матэрыяльнае становішча, выдзяляюць прадмет як атрыбут вясельнага рытуалу, аналізуючыя эпітэты, якія характарызуюць тую прымету, якая раней была не заўважана і раптам адкрываецца нам яе сэнс. Пастаянныя, метафарычныя, эмацыянальна-ацэначныя эпітэты ствараюць такі вобраз, карціну вясельнага рытуалу, якія выклікаюць своеасаблівыя асацыяцыі, адначасова яны выконваюць эмацыянальна-ацэначную ролю, падкрэсліваюць каляровыя адценні рытуальных, бытавых прадметаў, карцін прыроды, ствараюць лірыка-драматычны настрой вясельнай дзеі.

Своеасаблівасць эпітэту праяўляецца ў ступені ўстойлівасці і навізны, у прамым і пераносным сэнсе, у граматычных формах функцыяніравання, у падкрэсліванні розных бакоў з'яў і прадметаў (зрокавага, эмацыянальна-псіхалагічнага) рэальным і ідэальным і г.д.

Адна з характэрных асаблівасцей беларускай вясельнай песні заключаецца ў наяўнасці багатай <u>сімволікі</u>, рознай па сваймму значэнню.

<u>Сімволіка</u> вясельнай песні выступае ў сваёй прадметнай сітуацыйнай канкрэтнасці і выклікае разнастайныя, неадназначныя паэтычныя асацыяцыі. Яны выступаюць самастойнымі вобразнымі сродкамі, што пацвярджае абрадавую абумоўленасць твора, складанасць чалавечых пачуццяў, адлюстраваных у ім.

Напрыклад, вобраз каліны сімвалізуе дзявочую чысціню, маральна-духоўную прыгажосць, голубы — сваты, сокал — жаніх,

ручнік — сімвал яднання маладых, хлеб — сімвал дастатку, дабрабыту і г.д. Упершыню разглядаецца сімволіка колеру ў вясельных творах.

Багацце ідэйна-тэматычнага зместу абумовіла вялікую колькасць сімвалаў у вясельных песнях, іх паэтычнае хараство, высокую мастацкую дасканаласць. Сімволіка выкарыстоўваецца не толькі ў песнях, якія маюць кампазіцыю: "Сімвалічная частка плюс рэальная". Яна ўжываецца і ў экспазіцыі песень з сімвалічнай, умоўна-паэтычнай і рэальнай часткай.

Сімволіка функцыяніруе часцей за ўсё ў дзвюх першых: пачынаецца сімвалічная экспазіцыя з карціны вясельнага рытуалу ці з вобраза з выкарыстаннем метафары, алегорый.

Сімвал вызначае які-небудзь невядомы ці малавядомы прадмет (атрыбут вясельнага рытуалу), з'яву, хаця і не дае нам адразу магчымасці зрабіць вывад, каб канчаткова зразумець сэнс і значэнне яго ў кантэксце абрадава-жыццёвай дзеі.

Сімвалічны сэнс вобразаў вясельнай песні вызначаецца тым, што ён не толькі акрэслівае, але і дапамагае ў агульных рысах лакалізаваць малюнак ці карціну вясельнай дзеі. Там, дзе для рэалізацыі галоўнага сэнсу (мастацкай ідэі) неабходна раскрыць карціну, сімволіка з яе эканомнай выяўленчай палітрай дазваляе дасягнуць жадаемага выніку. Вобразы-сімвалы набываюць характэрныя рысы і ўключаюць у сябе магчымасць рознай іх трактоўкі ў залежнасці ад ролі ў творы і функцыі ў абрадзе. Але галоўная адметнасць захоўваецца ў творах, аб'яднаных агульным тэматычным адзінствам.

Найбольш часта сімволіка ўжываецца ў велічальных і імператыўных песнях, дзе глыбока раскрывае рысы персанажаў, іх стан, абрадавае дзеянне ў кантэксце вясельнага драматычнага спектакля.

Сімвалічная вобразнасць уваходзіць у вясельную песню з рэальнымі эпізодамі. Яна з'яўляецца кампазіцыйна адасобленым зачынам у форме адначлена, двухчлена, завяршае ланцужок паступовага звужэння вобразаў, уключаецца ў песню ў складзе другіх кампазіцыйных прыёмаў. Яна прадстаўляе сабою прыём скразнога паралелізму: радок сімвалічнай карціны сітуацыі з аднолькавай эмацыянальнай настроенасцю, чаргуючыся з другімі эпізодамі, ствараюць сэнсавыя пераходы паміж кампазіцыйна адасобленымі часткамі песні, выкарыстоўваюць адзін альбо два сімвалічныя

вобразы (пачынаючы і завяршаючы песню) па тыпу сэнсавага кола.

Сімволіка з'яўляецца канкрэтнай формай раскрыцця ідэі ў адпаведным вобразе, з'яве. Менавіта вобразная форма матэрыяльнага ўвасаблення ідэі надае сімвалу асацыятыўны характар, закранае ў сваім функцыяніраванні асобныя бакі духоўнага жыцця чалавека.

У гэтым аспекце сімволіка прадстаўляецца дзейснай і заканамернай формай адлюстравання рэчаіснасці ў яе глыбінных сувязях і адносінах.

З'яўляючыся утварэннем, якое дыялектычна ўвасабляе ў сабе адзінае і абстрактнае, матэрыяльнае і ідэальнае, сімволіка у вясельнай песні ўяўляе сабою завершаную і разам з тым універсальную форму раскрыцця чалавечага быцця ва ўсёй яго шматграннасці, у тым ліку і ў вясельным "драматычным спектаклі".

Сімвалічныя прадметы і з'явы, выкарыстоўваемыя ў вясельным абрадзе, адлюстроўваюць уласцівасці і адносіны ў сваім пачуццёва-канкрэтным вобліку і ўвасабляюць адпаведны чалавечы сэнс, усю шматгранную сукупнасць грамадскіх, рытуальна-этнічных нормаў чалавека. Сімволіка беларускіх вясельных песень некалькі адрозніваецца ад сімволікі ў другіх песнях тым, што яна атрымлівае ў гэтых творах больш дакладную расшыфроўку.

Песня пры дапамозе адпаведных сімвалаў адкрывае духоўнае чалавечае ў прыродзе і прыроднае ў чалавеку, новыя грані ўзаемасувязі чалавека і прыроды і выступае як сродак эмацыянальнага, выяўленчага ўздзеяння і ў якасці кампазіцыйнага, асабліва ў складзе паралелізму, зваротаў.

Ёсць адпаведны фонд прадметаў, з'яў, надзелены ўласцівасцямі сімвалаў. Самі па сабе, па-за вясельнай песняй, яны не функцыяніруюць, а рэалізуюцца ў выглядзе вобразна-выяўленчых сродкаў.

Своеасаблівасць сімволікі вясельных песень падкрэслівае арганічную народнасць, глыбокую нацыянальную самабытнасць гэтага віду твораў абрадавага фальклору.

Глыбока і ўсебакова аналізуецца <u>метафара</u> з пункту гледжання яе фармальнага адлюстравання падабенства паміж чалавекам і з'явамі прыроды, яе прадметамі. Як паэтычны сродак і асаблівая катэгорыя паэтычнага стылю яна дазваляе раскрыць гэту ўзаемасувязь, заснаваную на прынцыпах канкрэтызацыі, падабенства і

інш. Песня пры дасягненні вобразнасці выкарыстоўвае дзеяслоўную, яўную, скрытую метафару, якая выступае не ізалявана, а ў арганічным адзінстве з іншымі паэтычнымі сродкамі і, перш за ўсё, з эпітэтам, сімволікай, гіпербалай і сама пераходзіць з адной паэтычнай формы ў другую для рэалізацыі мастацкай задумы твора. Метафару вясельнай песні можна характарызаваць як паэтычны сродак, якому ўласцівы этнічныя прыметы.

У метафары вясельнай песні знаходзіцца ключ да разумення раскрыцця асновы мыслення, працэсу адлюстравання не толькі акаляючага свету, але і універсальнасці песеннага вобраза.

Жыццёвая, рытуальная карціна раскрываецца ад агульнага паняцця да метанімічнай метафары, сутнасць якой заключаецца ў тым, што з дапамогай дадатковых прымет і дэталей вобразна раскрываецца жыццёвая, абрадавая карціна больш канкрэтна, выразна.

Разгорнутая і ўвасобленая метафара стварае своеасаблівыя суадносіны паміж ідэальным і прадметным.

У скрытай метафары, заснаванай на ўнутраным супастаўленні падобных сітуацый, прадметна-бытавое, рытуальнае і яўнае не выцясняе абстрактнае, а як бы далучаецца і наслойваецца на яго, ствараецца асаблівы каларыт прыродных прадметаў, карцін, з'яў, з аднаго боку, і "ачалавечаных" дзеянняў, з другога боку.

У аснове дзеяслоўнай метафары ляжыць прызнак падабенства дзеянняў. Дысертант прыходзіць да высновы: метафарычнасць нельга разглядаць толькі як супастаўленне, таму што ў аснове яе ляжыць шматграннасць жыццёвых, у тым ліку і вясельных, абрадавых сітуацый, і таму яна выходзіць за межы простых паралеляў, асацыяцый, будуецца на лагічна апраўданых узаемападпарадкаваных сувязях. У гэтым выпадку ствараецца канкрэтная, глыбокая па сэнсу, народна-метафарычная вобразнасць з уласцівым рэальна-псіхалагічным каларытам.

Разглядаючы метафарычныя спалучэнні, аўтар прыходзіць да высноў, што з уласцівымі для вясельнай песні метафарамі выкарыстоўваюцца метафарычныя спалучэнні з апорнымі сэнсавымі словамі, якія служаць сродкам стварэння незвычайнай вобразнасці; з іх дапамогай адлюстраваны складаныя вобразныя сітуацыі, а сціслаcць канструкцыі з'яўляецца адной з своеасаблівасцей мастацкага стылю твораў.

Метафара выкарыстоўваецца ў вясельных песнях як спосаб

захаванасці цэласнасці вобраза. Яна выконвае характарызуючую функцыю, не замыкаецца ў вузкіх семантычных рамках.

Калі метафара развіваецца ў бок семантычнага аб'яднання, то сімвал, канцэнтруючы ў сабе ідэйны сэнс цэлага твора, наадварот, пашырае свой змест, але ў той жа час робіць яго ў значнай ступені дакладным.

Метафара паглыбляе сутнасць рэальнасці, а сімвал адводзіць ад яе, але, будучы сродкам характарыстыкі прадмета ці з'явы,яна заўсёды захоўвае арыентаванасць на сімвал і ахоплівае ўсё развіццё апавядання.

У метафары вясельнай песні знаходзіцца ключ да раскрыцця асноў мыслення, працэсаў у акаляючым асяроддзі да стварэння, персанажаў, прадметаў і з'яў, універсальнасці песеннага вобраза. Метафара тым самым умацавала сувязь з логікай, з аднаго боку, і міфалогіяй, — з другога. Яна выключна паэтычная у вясельнай песні і выкарыстоўваецца ў стварэнні вобразаў, раскрыцці матываў важнасці дзеянняў героя ў сацыяльна-бытавых, абрадавых сітуацыях.

Метафара ўмацоўвае ўзаемасувязь паміж матэрыяй і духам; гэта з'яўляецца сведчаннем таго, што чалавек у сваёй творчасці не толькі адкрывае падабенства, але і стварае яго.

У заключэнні дысертацыі падводзіцца вынік даследавання, робяцца высновы.

Вясельныя песні спецыфічныя па сваёй мастацкай форме: мова іх у параўнанні з мовай другіх народнапесенных жанраў беларускага фальклору больш эмацыянальная, значна часцей ужываюцца разнастайныя вобразна-выяўленчыя сродкі: эпітэт, сімволіка, метафара і інш. Мастацкую сістэму вясельных песень адрознівае вялікая напружанасць, дынамізм, сціласць, лаканічнасць у развіцці дзеі, строгая абумоўленасць кампазіцыі імператыўных, велічальных, карыльных песень.

Паэтыка вясельнай песні складаная і разнабаковая. Яна мае многа агульнага з творамі другіх песенных жанраў. Наяўнасць і роля шэрагу адных і тых жа паэтычных элементаў у вясельных песнях адрозніваецца. Гэта тлумачыцца тым, што яны адносяцца да жанраў абрадавага фальклору, таму маюць свае рысы паэтыкі. У той жа час адрозніваюцца ад іх, таму што ім уласціва свая ідэйна-мастацкая спецыфіка, якая поўнасцю залежыць ад зместу песень,

ЛНБ ім. В. Стефаника
АН України

ідэйна-эстэтычнай задачы, абрадавых дзеянняў.

Дзякуючы багаццю паэтычных сродкаў, высокай музычнасці, вясельная песня і цяпер застаецца жыццяздольным творам. Яна мае свайго творцу і выканаўцу, прыроду бытавання, валодае вялікай сілай мастацкага і эмацыянальнага ўздзеяння.

Па тэме дысертацыі апублікаваны наступныя артыкулы:

I. Эпітэт у беларускай вясельнай песні // Весці АН БССР, мерыя грамадскіх навук. 1990. № 5. С. 85-92.

2. Паралелізм — кампазіцыйны прыём вясельнай песні // Весці АН БССР, серыя грамадскіх навук. 1991. № 3. С. 85-92.

3. Паэзія чалавечнасці, кахання. (Збор твораў. Вяселле. Песні: У 6-ці кн. Мн., 1980—1988: выданне, структура, вывучэнне) // А.Куляшоў і вывучэнне яго творчасці ў ВНУ і школе у кантэксце сучаснай беларускай літаратуры. Магілёў, 1991.

4. Беларуская народная песня: Уступны артыкул да зборніка танцавальных песень "Вечар добры, дзяўчыначка". Мн., 1991. (РНМЦ МК БССР).

5. Вясельная песня: жанравыя асаблівасці // АНБ. Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору імя К.Крапівы. Культура Рэспублікі Беларусь: гісторыя, сучасны стан, перспектывы развіцця: Тэзісы дакладаў навуковай канферэнцыі. Мн., 1993. С. 157.

На правах рукописи

МАШУХ Николай Данилович

ПОЭТИКА СВАДЕБНОЙ ПЕСНИ:
КОМПОЗИЦИЯ, ХУДОЖЕСТВЕННЫЕ СРЕДСТВА:
ЭПИТЕТ, СИМВОЛИКА, МЕТАФОРА

Специальность: 10.01.09 — фольклористика

Автореферат

диссертации на соискание ученой степени
кандидата филологических наук


| | | |
|---|---|---|
| Падпісана у друк | 20.05.1994 г. | |
| Папера друк. № I | | Фармат 60 x 84, I/16 |
| Ул.-друк.л. I,39 | Ул.-выд.л I,5 | Афсетны друк |
| Тыраж I00 | Заказ № 01 | Бясплатна |

Інстытут мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору
імя К.Крапівы АНБ

220072 г. Мінск, вул. Сурганава, I, корп. I.
Надрукавана у вытворча-камерцыйнай фірме Арты-Фэкс.
220072 г. Мінск, вул. Скарыны, I.


457774

AB 30.387